# ТЭОРЫЯ І ГІСТОРЫЯ МАСТАЦТВА

*Т. У. ВАЙЦЯХОЎСКАЯ*

## БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ КАСЦЮМ: АСАБЛІВАСЦІ РАЗВІЦЦЯ

*Разглядаюцца этапы развіцця беларускага народнага касцюма ў XX ст. Даецца кароткі аналіз кожнага з іх і вызначаюцца ступень і спецыфіка захаванасці традыцыі ўжывання народнага адзення на кожным этапе. Звяртаецца ўвага на карэктнае ўжыванне тэрмінаў “народны касцюм”, “традыцыйны касцюм”, “аўтэнтычны касцюм”.*

Актуальнасць праблематыкі артыкула абумоўлена значнасцю народнага мастацтва і павышэннем увагі грамадства да традыцыйных рамёстваў у агульным працэсе развіцця сучаснай беларускай культуры. Узросшая цікавасць да самабытнай нацыянальнай спадчыны, яе здабыткаў сведчаць аб клопаце з боку дзяржавы, накіраваным на стымуляванне і развіццё народнага мастацтва “як аднаго з самых традыцыйных і пашыраных відаў нацыянальнай культуры” [7, с. 3].

XX ст. з’явілася пераломным у развіцці народнай культуры ў большасці развітых краін свету. Гэта час, калі хутка і кардынальна змяніліся не толькі эканамічныя і палітычныя структуры, але і грамадскія адносіны. На пачатак XXI ст. выпала такая шматлікая колькасць розных па сваім змесце падзей, што чалавеку патрабуецца пэўны час, каб асэнсаваць іх. Вельмі важным для нас застаецца пытанне самаідэнтыфікацыі чалавека, яго прыналежнасці да пэўнай этнічнай групы. Народны касцюм з’яўляецца адным з самых масавых і даступных чалавеку сегментаў нацыянальнай культуры. Як зазначае расійскі культуролаг С.П.Ісенка, “першапачаткова звязаны з працоўнай дзейнасцю чалавека і абрадавым ладам жыцця, касцюм адлюстроўвае рэчаіснасць у форме спецыфічных мастацкіх вобразаў, падаючы з дапамогай найскладанай семіятычнай сістэмы разам матэрыяльную, духоўную і сацыянарматыўную культуру этнасу” [5, с. 16–17]. Акрамя гэтага, як мяркуе расійскі даследчык В.Я.Гусеў, “мэтанакіраваная творчая дзейнасць у народным мастацтве, асабліва ў сферы стварэння і ўспрымання народнага касцюма, уключала людзей у эстэтычнае пераўтварэнне жыцця, выхоўвала многія яго эстэтычныя якасці” [4, с. 224]. Вартасць народнага касцюма як аднаго з важных кампанентаў народнага мастацтва заключаецца яшчэ і ў тым, што ён змяшчае ў сабе комплекс разнастайных відаў мастацка-творчай дзейнасці этнасу (ткацтва, вышыўка, пляценне, набойка і інш.).

Мэтай артыкула з’яўляюцца ўстанаўленне этапаў развіцця народнага касцюма на працягу XX ст. і аналіз спецыфічных рыс кожнага з іх, выяўленне карэктнага выкарыстання тэрмінаў “народны касцюм”, “традыцыйны касцюм”, “аўтэнтычны касцюм”.

У айчынным мастацтвазнаўстве народны касцюм і яго развіццё ў XX ст. мала даследаваліся. Гэтай праблемай мэтанакіравана пачалі займацца толькі ў другой палове XX ст. Аб паспяховасці зробленай працы сведчыць з’яўленне шэрага выданняў у 50–70-я гг. (“Беларускае народнае адзенне”, аўтары Л.А.Малчанава, Г.М.Курыловіч; “Беларускае мастацтва”: зборнік артыкулаў і матэрыялаў, “Беларускі этнаграфічны зборнік” (т. 1, вып. 1), падрыхтаваныя Інстытутам мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР і інш.). У 80-я гг. на хвалі нацыянальнага адраджэння з’яўляецца шэраг навуковых публікацый М.Ф.Раманюка, Я.М.Сахуты, якія разглядаюць рэгіянальныя разнастайнасці мастацка-дэкаратыўнага вырашэння беларускага народнага адзення. У 90-я гг. XX ст. працягваюцца распрацоўкі праблематыкі народнага беларускага касцюма, яго асобных частак і аздаблення (В.Я.Фадзеева “Беларуская народная вышыўка”), рэгіянальных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(Л.У.Дучыц “Касцюм жыхароў Беларусі”, Л.І.Маленка “Беларускі народны касцюм”) і лакальна-тыпалагічных (В.С.Цітоў “Гісторыка-этнаграфічнае раяніраванне матэрыяльнай культуры беларусаў”) асаблівасцей, тэхнікі ткацтва (В.І.Сілівончык “Адраджэнне рамяства”) і інш. У пачатку XXI ст. з’яўляецца першае комплекснае даследаванне па развіцці народнага мужчынскага і жаночага касцюма розных слаёў грамадства на працягу некалькіх стагоддзяў (аўтары В.М.Бялявіна, Л.Д.Ракава).

Нягледзячы на даволі грунтоўнае і шырокае вывучэнне праблемнага поля народнага касцюма, па-за ўвагай айчынных мастацтвазнаўцаў засталіся такія праблемы, як яго развіццё, бытаванне і змяненне ў розных сацыяльна-этнічных групах насельніцтва і пад уплывам новых эканамічных адносін.

Традыцыйны беларускі касцюм як комплекс найбольш выразнага вясковага адзення складаецца паміж другой паловай XIX і пачаткам XX ст. Асноўнымі кампанентамі строяў з’яўляліся ў жаночым касцюме: кашуля, па большасці паліковая, спадніца з прамых полак, фартух, пояс, ручніковыя ці платападобныя галаўныя ўборы. Мужчынскі касцюм складаўся з доўгай да кален кашулі, пояса, прамых і даволі вузкіх нагавіц, валенага галаўнога ўбору. Рэгіянальныя і лакальныя адрозненні ў касцюме ствараліся дзякуючы выкарыстанню шматлікіх па колеры і фактуры тканін, разнастайнымі дэталямі крою, прыёмамі дэкарыравання і дапаўненнямі. Так, у асобных мясцовасцях у касцюм уваходзіла безрукаўнае адзенне.

Пры разглядзе беларускага адзення другой паловы XIX – пачатку XX ст. у мастацтвазнаўчай літаратуры, акрамя тэрміна “традыцыйны беларускі касцюм”, сустракаецца тэрмін “беларускі народны касцюм”, пад якім разумеюць комплексы адзення жыхароў вёскі, якія непасрэдна вырабляліся самімі носьбітамі з хатніх тканін пры захаванні традыцыйных прыёмаў крою і ўпрыгожвання.

З пачаткам інтэнсіўнага развіцця прамысловасці (канец XIX – пачатак XX ст.) у тагачасных межах Беларусі нараджаецца новае разуменне карціны свету, што, у сваю чаргу, прывяло да змянення свядомасці сельскіх жыхароў, распаду цесных радавых і сямейных сувязей, якія былі асновай традыцыйнай культуры. Для першай паловы XX ст. характэрна паступовае згасанне традыцыі ўжывання народнага касцюма, але без поўнага перапынення вырабу і выкарыстання самаробнага адзення.

Да Вялікай Айчыннай вайны традыцыйнае адзенне ў вясковым асяроддзі захоўвалася ў асноўным як кампанент абрадавай дзейнасці (на вяселлі, дажынках, пахаванні і г.д.), як памяць аб папярэдніх пакаленнях, як матэрыяльная каштоўнасць (магло спатрэбіцца ў гаспадарцы, магчыма, не ў якасці касцюма, а як матэрыял). У залежнасці ад мясцовасці выкарыстанне народнага касцюма было неаднародным.

На тэрыторыі Усходняй Беларусі народны касцюм паступова выходзіць з ужытку. Ён нярэдка ўяўляў сабой “своеасаблівае спалучэнне элементаў традыцыйнага адзення і гарадскіх элементаў” [3, с. 98]. На тэрыторыі заходняй часткі Беларусі ў гэты перыяд нашэнне традыцыйнага адзення было звычайнай справай [6, с. 215–291].

У ваенны і пасляваенны час (40-я – першая палова 60-х гг. XX ст.) па прычыне спынення функцыянавання шматлікіх відаў вытворчасці, у тым ліку і лёгкай прамысловасці, узнікла жыццёвая неабходнасць вяртання да выкарыстання традыцыйнага адзення і матэрыялаў, якія сталі запатрабаванымі. Нягледзячы на ўплыў гарадской моды і выкарыстанне новых відаў крою, апрацоўкі, тэхналагічных прыёмаў і дэкору, захоўваюцца асноўныя формы традыцыйнага адзення як найбольш зручныя. Адсутнасць на гандлёвых паліцах фабрычных тканін прывяла да аднаўлення традыцыі вырошчвання льну, прадзення і ручнога ткацтва ў хатніх умовах. Гэты перыяд існавання культуры касцюма дае магчымасць ацаніць тыя ансамблі адзення, якія бытавалі ў другой палове XIX ст., да якіх вымушаны былі вярнуцца ў больш разнастайных формах па кроі, матэрыяле і дэкоры. Такую выснову можна зрабіць па матэрыялах этнаграфічных экспедыцый, якія праводзіліся ў канцы 60-х – 70-я гг. XX ст. сектарам этнаграфіі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук БССР [1, с. 6].

У 70 – 90-я гг. XX ст. падчас інтэнсіўнага развіцця прамысловасці, актыўнага ўзаемадзеяння вёскі і горада народны касцюм паступова страчвае сваю актуальнасць і значнасць. Для жыхароў сельскай мясцовасці, якія імкнуліся пераймаць гарадскую моду, ён становіцца “перажыткам мінулага”. Але ў той жа час, з боку інтэлігенцыі пачынаецца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

актыўнае стымуляванне інтарэсу да народнага касцюма як да унікальнай з’явы, якая трансліруе этнічныя традыцыі з мінулага ў сучаснасць. Гэта перыяд, калі новае пакаленне нацыянальна свядомай інтэлігенцыі было захоплена вялікай цікавасцю да роднай гісторыі і культуры. 70 – 90-я гг. ХХ ст. – перыяд асэнсавання каштоўнасцей народнага касцюма і аднačасовага знікнення яго ўжытку ў традыцыйным асяроддзі.

З улікам гістарычных этапаў існавання беларускай дзяржаўнасці, сацыяльна-эканамічных і грамадскіх зрухаў, якія адбываліся на працягу другой паловы ХІХ – ХХ ст., можна прасачыць развіццё народнага касцюма і выкарыстанне тэрмінаў, якія яго абазначаюць. Так, традыцыйным і народным беларускім касцюмам мэтазгодна абазначаць комплексы сялянскага адзення другой паловы ХІХ ст. Вялікім уплывам гарадской культуры і новым грамадскім светапоглядам характарызуюцца хуткія змены ў сялянскай традыцыйнай культуры першай паловы ХХ ст. Фарміруецца новы тып жыхара вёскі. Касцюм ваеннага і пасляваеннага часу можна лічыць максімальна набліжаным да касцюма другой паловы ХІХ ст. Пачынаючы з 70-х гг. ХХ ст. і па сённяшні час народны касцюм разглядаецца як унікальная культурная каштоўнасць, дзякуючы якой працягваюць існаваць і развівацца традыцыі этнасу.

Такім чынам, у залежнасці ад перыяду існавання комплексаў традыцыйнага беларускага вясковага адзення можна даць некалькі азначэнняў тэрмінам “беларускі народны касцюм” і ”традыцыйны беларускі касцюм”.

Аднačасова традыцыйным і народным беларускім касцюмам можна называць комплекс сялянскага адзення другой паловы ХІХ ст., які існаваў у пэўным сельскім асяроддзі, дзе асноўнымі крыніцамі для яго стварэння былі мясцовыя традыцыі вырабу адзення, натуральныя самаробныя матэрыялы.

Вялікім уплывам гарадской культуры і новым грамадскім светапоглядам характарызуюцца хуткія змены ў сялянскай традыцыйнай культуры ў ХХ ст. да пачатку Вялікай Айчыннай вайны. З’яўляецца новы тып сельскага жыхара. Але сувязь з традыцыйным адзеннем поўнасцю не перапынена. У некаторых мясцовасцях яшчэ захоўваюцца архаічныя формы і комплексы традыцыйнага адзення. З’яўляюцца і новыя формы, у якіх самым разнастайным чынам злучаюцца ў арганічнае цэлае традыцыі і навацыі, што было характэрна і для народнага касцюма.

Касцюм ваеннага і пасляваеннага часу можна лічыць максімальна набліжаным да традыцыйнага касцюма другой паловы ХІХ ст., што дае падставу ўжываць у адным сэнсе паняцці “народны касцюм” і “традыцыйны касцюм” у гэты перыяд.

Пачынаючы з 70-х гг. і па сённяшні час народны касцюм з’яўляецца ў большай ступені культурнай з’явай, які працягвае транслiраваць этнічныя традыцыі, ён ствараецца з улікам даных навуковых даследаванняў і вяртаецца ў натуральнае (сялянскае) асяроддзе праз розныя інфармацыйныя каналы (выстаўкі, кірмашы, выданні, Дамы рамёстваў, фальклорныя фестывалі). Таму выкарыстанне тэрміна “традыцыйны касцюм” больш правільнае для ўзораў канца ХІХ ст. і пасляваеннага дзесяцігоддзя, 1945–1955 гг., якія ў асноўным захоўваюцца ў музейных калекцыях і з’яўляюцца высокамастацкімі ўзорамі народнай прыкладной творчасці. Ужыванне тэрміна “народны касцюм” больш карэктнае для разнастайных інавацыйных варыянтаў, з рознай ступенню захаванасці традыцыйных элементаў і праяўлення ўплыву культуры горада. Тэрмін “аўтэнтычны касцюм” указвае на існаванне жывой традыцыі выканання таго своеасаблівага комплексу, які і ў сённяшні час вырабляецца самімі носьбітамі і ўжываецца ў розных сферах жыцця (вясковых святах, пры адпраўленні культавых патрэб, у самадзейнай творчасці). У гэтым выпадку творца арыентаваны на традыцыйныя вобразныя строі, мясцовы і ўласны густ. Такі касцюм мае яскрава выяўленую рукатворнасць.

Распаўсюджанне традыцыі стварэння народнага касцюма прафесіяналамі спрыяе замацаванню ў грамадскай свядомасці разумення і ўспрымання касцюма як знака, сімвала, нацыянальнай каштоўнасці. Нягледзячы на кардынальнае пераасэнсаванне ўсіх сфер жыцця, у тым ліку і традыцыйнай беларускай культуры, народны касцюм захаваўся не толькі ў якасці музейнага экспаната, але і як цэннасць, што існуе і развіваецца ў сучаснай нам рэчаіснасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*1. Беларускае* народнае адзенне / Л.А.Малчанава [і інш.]. – Мн.: Навука і тэхніка, 1975. – 95 с.
*2. Бялявіна, В.М.* Жаночы касцюм на Беларусі / В.М.Бялявіна, Л.В.Ракава. – Мн.: Беларусь, 2007. – 351 с.
*3. Бялявіна, В.М.* Мужчынскі касцюм на Беларусі / В.М.Бялявіна, Л.В.Ракава. – Мн.: Беларусь, 2007. – 303 с.
*4. Гусев, В.Е.* Эстетика фольклора / В.Е.Гусев. – Л.: Наука, 1967. – 286 с.
*5. Исенко, С.П.* Этнокостюмология в контексте современной культуры: автореф. дис. … д-ра культурологии: 24.00.02 / С.П.Исенко. – М., 1999. – 45 с.
*6. Лабачэўская, В.А.* Зберагаючы самабытнасць / В.А.Лабачэўская. – Мн.: Беларуская навука, 1998. – 375 с.
*7. Сахута, Я.М.* Народнае мастацтва Беларусі / Я.М.Сахута. – Мн.: БелЭн, 1997. – 287 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ